№ 45(148)
2 – 8
лістапада 2000 г.
Заснавана ў ліпені 1997 г.

http://kapp.nsys.by

Заснавальнік і
галоўны рэдактар
Віктар ІВАШКЕВІЧ

РАБОЧЫ

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

АД СЕРАДЫ ДА СЕРАДЫ

ВЫБАРЫ

Праектам Закона аб бюджэце на 2001 год прадугледжана, што расходы на правядзенне ў Беларусі прэзідэнцкіх выбараў у будучым годзе складуць 12 млрд. рублёў. Гэта ў тры разы больш у параўнанні з аб'ёмам бюджэтных сродкаў, выдатакаваных на правядзенне парламенцкіх выбараў 2000 года.

РЭЙТЫНГ

Па звестках Хартыі'97, апошняе службовае сацыялагічнае даследаванне, праведзенае беларускімі ўладамі, выклікала чарговы прыступ панікі ў адміністрацыі прэзідэнта. 15 кастрычніка, падчас галасавання ў першым туры выбараў у палату прадстаўнікоў, дзяржаўныя сацыёлагі высветлілі, што рэйтынг А. Лукашэнкі па ўсёй краіне ледзь дасягае 22%. Зараз інтэнсіўна распрацоўваюцца меры па папулярызацыі цяперашняй улады.

ДЫПЛАМАТЫЯ

У Беларусь прыбыў і прыступіў да выканання сваіх абавязкаў пасол ЗША Майкл Козак.

ПАДАТКІ

Як і раней, беларусы будуць аддаваць на патрэбы дзяржавы 30% сваіх даходаў у выглядзе падаткаў. Між тым у Расіі падаходны падатак з фізічных асоб знізілі да 13%.

ЖЫЛЛЁ

План па будаўніцтву жылля сёлета зноў не выконваецца: на кастрычнік будаўнікамі здадзена толькі 70% ад таго, што прадугледжвалася ўрадам.

ЭКАЛОГІЯ

Беларускія хімічныя прадпрыемствы больш не будуць знішчаць азонавага слоя. Сусветны банк і Глабальны экалагічны фонд дапамаглі ім набыць новае бясшкоднае абсталяванне.

САЮЗ

Новы югаслаўскі прэзідэнт Ваіслаў Каштуніца адмоўна ставіцца да ідэі далучэння сваёй краіны да саюза Беларусі і Расіі. Такую заяву зрабіў ён у інтэрв'ю Інтэрфаксу.

30 кастрычніка ў многіх краінах былога СССР на дзяржаўным узроўні быў адзначаны **Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій**. На Беларусі ён не адзначаўся.

ТРАВА ЗАБЫЦЦЯ

Мо, у нас не было палітзняволеных? Але толькі ў Курапатах, урочышчы пад Мінскам, з 37-га па лета 41-га года энкавэдзісты знішчылі і закапалі (а потым пасадзілі тут дрэвы і кусты) каля 250 тысяч чалавек. Свае курапаты ёсць у розных кутках Беларусі, ды няма такіх даследчыкаў, як Зянон Пазняк і Яўген Шмыгалёў, якія 12 гадоў таму раскрылі страшную курапацкую праўду.

У гады сталіншчыны вынішчалі эліту нацыі — вучоных, настаўнікаў, інжынераў, святароў... Смерць касіла ў сібірскіх лагерах вывезеную туды эліту беларускага сялянства. За гэтымі людзьмі не было аніякай віны. Іх забівалі дзеля адной мэты — каб было зручна кіраваць астатнімі, скаванымі страхам.

У гады брэжнеўшчыны страляць не было патрэбы: страх дзейнічаў. А тых нешматлікіх іншадумцаў, каго не маглі зламіць, адпраўлялі ў "псіхушкі".

Дык чаму ж афіцыйная Беларусь "замаўчала" 30 кастрычніка?

Адказ адзіны: лукашэнкаўскія ўлады — духоўныя нашчадкі тых, хто кіраваў у савецкія часы. Хіба ў нас не хапаюць удзельнікаў грамадзянскіх (дазволеных!) акцый? Хіба не б'юць "за палітыку"? Хіба ў нас не знікаюць сярод белага дня вядомыя людзі? Хіба маральна нас не "топчуць"?

Мы ўсе, і тыя, хто ходзіць на акцыі пратэсту, і тыя, хто ў гэты час корпаецца на сваім агародзе, — патэнцыяльныя ахвяры. Не трэба ашуквацца: мы недалёка адышлі ад 37-га года, калі "ворагам народа" можна было аб'явіць любога чалавека. Так што 30 кастрычніка — самы што ні на ёсць беларускі дзень.

Практычна ён супаў з Дзядамі — старадаўнім звычаем, Днём памяці продкаў, які таксама не прызнае лукашэнкаўская ўлада.

29 і 30 кастрычніка грамадскасць арганізавала жалобнае шэсце ў Курапаты, правяла мітынгі-рэквіемы, усталявала на месцах знішчэння людзей крыжы. Афіцыйнае тэлебачанне паказала шэсце, але толькі дзеля таго, каб паздзекавацца ў сваім каментары: маўляў, гэта шоу.

За 12 гадоў улады нічога не зрабілі, каб стварыць у Курапатах мемарыял. Толькі простыя людзі, якім баліць, талакой прыводзяць лес у парадак, ставяць крыжы (іх тут ужо больш за 60), садзяць кветкі, змагаюцца з марадзёрамі і прыхільнікамі шашлыкоў на прыродзе... Так ствараецца Народны мемарыял. Ён шчыры.

Аднак... Мала яшчэ мінчан прыходзіць сюды, паасобку і з сем'ямі, каб аддаць даніну памяці, каб ачысціць урочышча ад смецця і бруду, пасадзіць прыгожыя кветкі, зрабіць лавачкі. А, між іншым, любы чалавек, у сям'і якога былі ці не былі рэпрэсіраваныя, можа прыйсці ў Курапаты і паставіць крыж. Ён можа зрабіць яго сваімі рукамі, на плячах пранесці сцежкай памяці, усталяваць тут, дзе пакуль што амаль усё зарасло травой забыцця.


Улады ўладамі, але ж мы — людзі!

Не трэба чакаць, калі Мінгарвыканкам прышле сюды паркавых архітэктараў і рабочых. Не трэба чакаць, што "Мартыралог Беларусі" ці іншая арганізацыя або партыя пазаве на мітынг. Зробім усё самі. Па хрысціянскаму абраду. Бо тут пад кожным дрэвам — усе нашы: бабуля, старэйшы брат, суседскі дзед, стрычная сястра...



"ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ ПАЧНЕЦЦА МЕНАВІТА З КУРАПАТАЎ..."

21 і 28 кастрычніка ў Курапатах адбыліся суботнікі. Людзей было няшмат. Увагу прыцягвалі маладыя твары. Наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў некаторых талакоўцаў, якія капалі ямы пад крыжы, выносілі з лесу смецце, высякалі кусты, рабілі сцежкі. (Дарэчы, падчас суботніка 28 кастрычніка Курапаты наведала дэлегацыя з амерыканскага пасольства з вянкамі і кветкамі.)



Валерыя ЧАРНОМСКАЯ, студэнтка радыётэхнічнага універсітэта, будучы эканаміст ці праграміст-вэбмайстар:

— Я ведаю: тут былі забіты людзі. Іх можна было забіць, але нельга забыць... Слава Богу, што тут час ад часу чытаюцца малітвы, устанаўліваюцца крыжы... Мы павінны аднавіць свае старыя святы, назвы, помнікі — гэта тое, на чым трымаецца свядомасць. Я мяркую, што вяртанне памяці народа пачнецца менавіта з Курапатаў... Я буду прыходзіць сюды і надалей, убіраць гэта святое месца. Тут для мяне няма чужых.

Цімох АКУДОВІЧ, Сяргей КРУЧОНАК, Валерый ГОРАЦКІ, студэнты педагагічнага універсітэта, будучыя вучоныя, настаўнікі:

— Мы не маглі не прыйсці на суботнік у Курапаты, хоць ніхто з нашых сям'яў не быў рэпрэсіраваны... Вось дапамагаем старэйшым, хто тут даўно клапоціцца аб захаванні памяці... Калі б мінскія студэнты не баяліся непрыемнасцяў, то маладых прыйшло б больш... Мы выбралі навуку — гісторыю, мы павінны ўсё ведаць пра сваіх продкаў і расказаць праўду іншым людзям.

Дзяніс і Вольга ЗУБКО, студэнты педагагічнага універсітэта, маладажоны:

— Мы ў Курапатах ужо другі раз. Мінулым летам працавалі тут, закопвалі ямы, якія зрабілі марадзёры, што шукаюць залатыя каронкі... Упершыню нас прывёў сюды аспірант нашага універсітэта Ігар Сідаровіч, дзякуй яму. А любоў да гісторыі, археалогіі прывіў любімы выкладчык Лявон Калядзінскі. Курапаты — не проста месца забоў... Гэта ўжо сімвал... Калі ў нас будуць дзеці, мы будзем прыходзіць сюды разам з імі.

МОЙ ТЫДЗЕНЬ

Я согласен, что мы не решаем многие проблемы. Но куда болезненней я воспринимаю высказывания типа «Не надо заниматься политикой». Многие, даже некоторые соратники по профсоюзу почему-то думают, что заниматься политикой – это обязательно стремиться к власти. В действительности, заниматься политикой нужно, чтобы влиять на власть в пользу людей труда.
Александр БУХВОСТОВ.

СБОРОЧНЫЙ ЦЕХ

Аналитические материалы о месте и роли беларусского профсоюзного движения в современной жизни нашей страны появляются на страницах республиканских газет нечасто. Редакция газеты «Рабочы», освещая профсоюзную деятельность как независимых, так и традиционных профсоюзов, решила восполнить этот пробел, предложив своим читателям дискуссионные материалы по проблемам профсоюзного движения Беларуси. Ведь впереди – президентские выборы. И Федерация профсоюзов Беларусская уже сегодня открыто заявила, что будет принимать активное участие в этом процессе. Подобные заявления, как и рассказ о ближайшей стратегии и тактике Федерации, были сделаны на страницах газеты лидером ФПБ Владимиром Гончариком и председателем профсоюза работников автосельхозмаша Александром Бухвостовым (№ 43 от 19—25 октября 2000 г.). Свое отношение к позиции профсоюзных лидеров высказал беларусский политолог В.Мацкевич в статье «Последнее и решительное китайское предупреждение от ФПБ» (см. прошлый номер «Рабочага»). Редакция посчитала необходимым обратиться к Александру Бухвостову и Владимиру Гончарику с предложением собраться в «сборочном цехе» газеты «Рабочы» и продолжить начатый разговор. Сегодня у нас один из них.

Не знаешь ты жизни, Владимир!

Честно говоря, особого желания дискутировать с политологом-либералом Мацкевичем по поднятым им вопросам не появилось. В первую очередь потому, что от его статьи «Последнее и решительное китайское предупреждение от ФПБ» веет архивно-сундучным душком.

Но с другой стороны, как человек, профессионально работающий в профсоюзах, я вижу свой долг в обсуждении поднятых вопросов. Мне приходится встречаться не только с профсоюзными лидерами формального международного движения, но также и с представителями неформального, т.е. теми, кто занимается политической деятельностью. Кроме того, я избран коллегами из стран СНГ и других стран представлять интересы Восточной и Центральной Европы в Исполкоме Международной Федерации металлистов, являюсь членом правления организации «TIE», занимающейся обменом информацией в борьбе с транснациональными корпорациями. Поэтому хорошо знаю ситуацию, которая складывается как в национальном профсоюзном движении, так и в международном.

Поэтому с полной уверенностью могу сказать, что суждения Мацкевича о качестве трудовых отношений в Беларуси поверхностны, не учитывают современных тенденций как национального, так и международного профсоюзного движения, борющегося с экономической глобализацией, когда небольшая группа финансовых магнатов контролирует основные производства и финансовые потоки.

Для профсоюзов Беларуси проблема глобализации пока не так актуальна. Ведь наша страна еще не вошла полностью в открытую мировую экономику, предприятия продолжают работать в автономных режимах, очень тяжело осваивая рынки. Но больше чем уверен, в скором будущем все мы окажемся во владении транснациональных корпораций, в первую очередь восточных, а точнее, российских: «Газпрома», «Лукойла». Посмотрите, как активно они забивают свои сваи на территории нашей страны. Ближайшая же наша цель – защитить демократию. На это и нужно направить общие усилия, ибо профсоюзы могут действовать эффективно только в условиях демократии и правового государства.

Оценивая критику Мацкевича с этих позиций, я думаю, он просто не владеет диалектическими методами оценки ситуации. Для него лишь белое и красное. Он думает, что классический трипартизм, и в первую очередь членство директоров в профсоюзных организациях является сегодня для нашего профсоюзного движения главным и решающим недостатком. В начале 90-х наш профсоюз внес новую статью в свой Устав, согласно которой при переходе работника, члена нашей организации, на руководящую должность, связанную с наймом, его членство в профсоюзе приостановилось. Начав реализацию этого новшества, мы столкнулись с большими трудностями. Поэтому в 95-м текст данной статьи несколько изменили: быть или не быть в профсоюзе руководителю должен решать профком предприятия. Настойчивость Мацкевича внедрить трипартистскую систему в трудовые отношения Беларуси неоправдана. Практика доказывает, что каким ни был трипартизм, выигрывает от него только капитал, профсоюзам очень сложно вести успешные действия.

Если посмотреть на мировую практику, то там членство в профсоюзах не такое строгое, как может показаться. Когда человек, будь-то руководитель или обыкновенный рабочий, служащий, захотел вступить в профсоюз, он подает заявление, и его, как правило, принимают.


К сведению В.Мацкевича: вопрос о членстве директоров в профсоюзе обсуждался с представителями Международной организации труда (МОТ) во время последнего визита делегации МОТ в Беларусь. Кари Тапиола, глава делегации, исполнительный директор Международного бюро труда, говорил о трех путях решения этого вопроса: 1. Исключить какую-то часть руководителей. 2. Ждать, когда процесс решится сам по себе, т.е. когда у руководителей появится больше самостоятельности, они утвердятся либо как собственники, либо – управляющие и выйдут из профсоюза. 3. Создать свою законную полноправную организацию, защищающую интересы нанимателей и против профсоюза, и против государства. Какой из этих путей приоритетней? Можно, конечно, избрать первый, как предлагает В.Мацкевич. Но что это даст? Усилит противоречия между директорским корпусом и рабочими. Кто от этого выиграет? Лукашенко и его режим. К чему вы призываете нас, политолог Мацкевич? Помогать этому тоталитарному режиму?Мы выступаем за второй вариант. Он позволяет нам консолидировать наши действия, направленные на борьбу за демократию, новую социальную политику. При таком подходе директор важен для нас как политический союзник. Сегодня многие руководители предприятий искренне сочувствуют профсоюзному движению, потому что видят: идет борьба за демократию. Многие руководители готовы помогать в этой борьбе.

Упрекать в нынешней ситуации профсоюзы в том, что мы не защищаем интересы трудящихся, а защищаем только свои места – это, скорее всего, звучит не как речь политолога, а как речь провокатора, который хочет подставить профсоюзы под очередную волну критики, сыграть на руку политическому режиму, уподобляясь некоторым представителям государственных СМИ. Ведь мы защитили интересы не лидеров, а принципы профсоюза, потому что именно на Гончарике, Ярошуке, Федынiче и Бухвостове сошлась острота борьбы между желанием подчинить профсоюзы и движением профсоюзов за свою независимость. То, что профсоюзы не сдали своих активистов, боролись за них, говорит о том, что сегодня Федерация профсоюзов большей частью стоит на позиции независимости профсоюзного движения, и в первую очередь, независимости от власти. Я уважаю Гончарика в сегодняшней профсоюзной ситуации за то, что он занял верную политическую позицию и стал одним из лидеров оппозиции. Добившись этой победы, Федерация доказала, что готова решать следующую насущную задачу нашего времени – создавать противовес тому режиму, который тянет трудящихся и весь народ в нищету. И я думаю, если профсоюзы выдвинут из своих рядов даже кандидата в президенты, это должно быть воспринято всеми естественно.

И в конце о качестве предлагаемой Мацкевичем дискуссии. Во-первых, любые дебаты предусматривают для оппонента отвечать, а не оправдываться, как нас вынуждает это делать автор статьи. Во-вторых, если ты хочешь участвовать в диалоге о современном профсоюзном движении,сначала изучи его состояние. И в-тр их, очень жаль, что разговор о профсоюзах начался с явных негативизмов к тем людям, которые прошли сложный путь становления, но они ведь пришли к убеждению, что нужно защищать независимость профсоюзного движения, к тому же хорошо зная и понимая положение трудящихся. Пусть Федерация профсоюзов не такая мобильная, как хотелось бы. Но профсоюз – это не машина, где простой заменой детали можно дать агрегату новую жизнь. Профсоюз – это люди. Истинно свободные профсоюзы могут быть созданы только свободными людьми.

Александр БУХВОСТОВ.

Александр Иванович БУХВОСТОВ
Родился 22 ноября 1944 года в городе Орел (Россия). Окончил Минский радиотехнический институт (1968), аспирантуру Института технической кибернетики Академии наук БССР (1982). С 1971 по 1990 год – председатель профкома ПО «Гомсельмаш». Сопредседатель Гомельского забастовочного комитета (1990), член республиканского стачечного комитета (1991), председатель Совета профсоюза работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения (с 1990), председатель Беларусской партии труда (1993–1999). Депутат Верховного Сов ета Республики Беларусь (с 1995).





СТУДЭНТЫ ПРАТЭСТУЮЦЬ

Дзве акцыі пратэсту пад агульнай назвай "Студэнт. Мастак. Жабрак" правялі 30 кастрычніка студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў. Акцыі былі скіраваны супраць адсутнасці ўмоў для працы ў студэнтаў акадэміі. "Ужо некалькі гадоў мы не атрымліваем неабходных нам цынку, друкарскіх фарбаў, войлаку, асфальту, —заявілі студэнты-актывісты.— Такім чынам, кіраўніцтва акадэміі паціху знішчае кафедру станкавай графікі, якая мае сусветны ўзровень і глыбокія традыцыі". Прыехаўшыя прадстаўнікі Міністэрства культуры запрасілі студэнтаў на перамовы і паабяцалі па меры магчымасці выканаць усе іхнія патрабаванні, а таксама паскорыць працэс рамонту акадэміі.



ПРОГРАММА ТВ ПОНЕДЕЛЬНИК, 6 НОЯБРЯ

БТ
7.00, 9.00, 15.00, Новости.
7.15 Х/ф. «Зеленый фургон». 1-я серия.
8.30 «Бровады в Сан-Тропезе». Док.фильм.
9.10 Дневник VI Международного музыкального фестиваля «Золотой шлягер-2000».
9.25 Кинокомедия «Девушка без адреса».
10.50 Здоровье. Тележурнал.
11.15 Теленавигатор.
11.35 «Мумми-тролль и другие», «Мумми-тролль и комета», «Путь домой». Мультфильмы.
12.30 «Все мы родом из детства». IV Всебелорусский телефестиваль юных талантов. Финал. Часть 5-я.
13.20 «Кортик». Худ.фильм для детей («Беларусьфильм»). 1-я серия.
14.30 «Белая Вежа-2000». Международный театральный фестиваль (г.Брест).
15.15 И.Костолевский, Н.Белохвостикова, А.Делон в худ.фильме «Тегеран-43».1-я и 2-я серии.
17.45 КВН. «День гражданской авиации».
19.05 Дневник VI Международного музыкального фестиваля «Золотой шлягер-2000».
19.20 Е.Яковлева, Е.Сидихин, С.Маковецкий в мелодраме «Ретро втроем».
21.00 Панорама.
21.50 VI Международный музыкальный фестиваль «Золотой шлягер-2000». «Песни нашего двора».
0.20 Третий тайм.

ОРТ
07.00 Новости.
07.10 Приключенческий фильм «Проект «Альф».
09.00 Новости.
09.10 Смак.
09.30 Смехопанорама.
10.00 Фильм «Узник замка Иф».
11.25 Песня года.
11.55 Кинолегенда «Лоуренс Аравийский».
14.00 Новости.
14.15 «Лоуренс Аравийский».
16.15 «Чтобы помнили...» Олег Борисов.
17.00 Новости.
17.10 «Ералаш».
17.30 Боевик «Скала».
20.00 Время.
20.40 Комедия «Москва на Гудзоне».
22.50 Триллер «Прибытие».

РТР
06.30 «Моби Дик». Фильм для детей.
09.00 Доброе утро, страна.
09.50 «Сто к одному».
10.35 Сам себе режиссер.
11.05 «Друзья-II». Сериал.
11.35 Золотой ключ.
11.55 «Комиссар Рекс». Сериал.
13.00 Вести.
13.20 Комедия «Игра на миллионы».
15.10 Док.фильм «Русская трагедия». «Мятеж против Брежнева».
16.10 Разговор с Америкой: Дж. Буш или А.Гор.
16.45 Моя семья.
17.45 Сам себе режиссер.
18.15 «Городок»-ретро.
19.00 Вести.
19.30 «Задорная компания».
21.35 Фильм «Основные цвета».
00.20 Прогноз погоды.

НТВ
07.00 Сегодня.
07.15 Комедия «Антоша Рыбкин».
08.05 Сериал «Агент национальной безопасности».
09.00 Сегодня.
09.20 Вчера в «Итогах».
10.45 Куклы.
11.00 Сегодня.
11.30 «Итого».
11.55 Детектив «Ночное происшествие».
13.35 «Старый телевизор» представляет...
15.00 Сегодня.
15.25 Фильм «Собачье сердце».
18.00 Сегодня.
18.35 Фильм «Восток - Запад».
21.00 Сегодня.
21.45 Премьера НТВ. «Российская империя».
22.50 Тушите свет.
23.05 Комедия «Клетка для безумцев-1».
00.55 «Футбольный клуб».

КУЛЬТУРА
09.05 «Бег». Худ.фильм. Часть 1-я.
10.35 Мультфильмы.
11.35 «Российский курьер».
12.15 Бабушкины рецепты.
12.25 «Щелкунчик».
12.50 «Камаринская». Мультфильм.
13.00 Дворцовые тайны.
13.30 Новости культуры.
13.45 Рассказы старого сплетника.
14.10 «Кин-дза-дза». Худ.фильм. 2-я серия.
15.15 «История любви». Спектакль.
16.50 «Секретный агент». Худ.фильм. 2-я серия.
17.40 «Сферы».
18.20 «Окуджаве посвящается...»
18.50 Вечерняя сказка.
19.00 «Рекс». Мультсериал.
19.15 Док.фильмы.
19.50 Билет в Большой...
20.20 Блеф-клуб.
21.00 Новости культуры.
21.20 Джаз мемориз.
21.45 «Бег». Худ.фильм. Часть 2-я.

ТВ6
06.00 Боевик «Схватка в воздухе».
07.35 Дорожный патруль.
07.50 День за днем.
09.25 Телемагазин в Минске.
09.45 «Все в сад!».
10.15 «Про любовь».
10.45 Катастрофы недели.
11.45 «Своя игра».
12.15 Комедия «Горячие денечки».
14.00 Новости.
14.15 Худ.фильм «Доктор Айболит».
15.30 Мультфильм «Пингвины».
15.45 Телемагазин в Минске.
16.00 Телемагазин в Минске.
17.10 Комедия «Вместе с Дидлами».
19.00 Новости дня.
19.30 «Вы - очевидец».
20.35 Дорожный патруль.
20.45 Боевик «Завтра не придет никогда».
22.35 Дневник театрального фестиваля «Чайка».
22.55 Комедия «Все взаимно».
00.55 Дорожный патруль.

«ЗА ПОВЫШЕНИЕ ЖИЗНЕННОГО УРОВНЯ РАБОЧИХ!»

с таким лозунгом 15 ноября на улицы Минска планируют выйти рабочие Минских тракторного и моторного заводов. Акцию в знак протеста против несвоевременной выплаты заработной платы проводит Свободный профсоюз металлистов.

С лета на моторном появились задержки с выплатой заработной платы, хотя завод работал в обычном режиме. Моторы ежедневно отгружались на склады Минского тракторного, да вот деньги главный покупатель агрегатов ММЗ отдавать не торопился. Администрация моторного на справедливые возмущения своих рабочих разводила руками и посылала ... на тракторный.

Обращались моторозаводцы к руководству тракторного, но и там им дали от ворот поворот. Чтобы разорвать заколдованный круг, рабочие и решили организованно пройти шествием от моторного завода, что на улице Ваупшасова, до проходной тракторного, что на улице Долгобродской. Там и высказать свои требования. Конкретный маршрут согласовывается с Мингорисполкомом. **Справки по телефону: 227-03-61.**



"Зрэшты, у тым, што Курапаты ў такім стане, вінаватае ўсё грамадзтва. Пахадзіце па Беларусі, паглядзіце на могілкі. У большасьці развал і запусьценьне. Але настаў час зьбіраць камяні. І гэты час рэальны. У новай Беларусі ўшануем нявінназабітых, памятаючы пра справядлівасьць, бо ніштo не мінае бясьсьледна".
Зянон Пазьняк. 24 верасьня 1991 г.

Мікола КРЫВАЛЬЦЭВІЧ: "Я не магу бясконца капаць магілы"



У нядзелю у Курапатах ставілі крыжы. Іх зрабілі і прынеслі ўдзельнікі шэсця, якія адзначылі Дзяды традыцыйным мітынгам-рэквіемам на месцы масавых расстрэлаў людзей. Усклалі вянкі і букеты, запалілі на могілках свечкі.

На мемарыяльнай лаўцы, усталяванай амерыканцамі, і ля крыжа "Пакутнікам Беларусі" ляжалі кветкі з надпісамі па-англійску на чорных стужках: "Ад народа Злучаных Штатаў народу Беларусі і ахвярам рэпрэсіі". І ніводнай кветачкі – ад уладаў Беларусі.

Пра сённяшнюю сітуацыю вакол Курапатаў мы папрасілі рассказаць кандыдата гістарычных навук Міколу Крывальцэвіча, які ў складзе археалагічнай групы разам з Зянонам Пазьняком праводзіў першыя раскопкі магільных пахаванняў у 1988 годзе.

— Спадар Мікола, Савет Міністраў яшчэ ў 1989 годзе прыняў пастанову пабудаваць у Курапатах помнік ахвярам масавых рэпрэсій. Чаму яго няма дагэтуль?

— Пры тым урадзе, які быў пасля 1991года напачатку нацыянальнага будаўніцтва, яшчэ можна было дачакацца нейкага ўшанавання ахвяраў рэпрэсій з боку дзяржавы. Але ўлада змянілася і, безумоўна, па змесце сваім яна зараз — савецкая. Таму і не зацікаўленая ў тым, каб людзі ведалі пра страшную праўду аб трагедыі ў Курапатах.

Усе камісіі, якія расследавалі гэту справу, адназначна сцвердзілі, што расстрэльвалі мірных людзей у савецкі час органы НКВД. Ёсць матэрыялы эксгумацыі, знайшліся сведкі (іх больш за 200 чалавек), якія бачылі расстрэлы ці чулі пра іх ад іншых. Людзі расказалі, што гэта адбывалася з канца 30-х да пачатку вайны. Таму няма абсалютна ніякіх падстаў гаварыць пра тое, што тут пакінулі свой след фашысты.

— Калі кардынальна змянілася стаўленне беларускай ўлады да Курапатаў?

— Безумоўна, з прыходам Лукашэнкі. Гэта быў паваротны момант у адносінах да Курапатаў. З той пары месца забойстваў ніхто з афіцыйных уладаў не наведаў. І вянкоў ад іх мы тут ніколі не бачылі. Толькі ад грамадскіх арганізацый і замежных амбасадаў. Пры Лукашэнку ўжо двойчы рабіліся захады па пераглядзе курапацкай справы. Але нават пры вялікім жаданні знайсці "нямецкі след" гэтыя спробы заканчваліся нічым. Бо інакш пра такія "доказы" ўлады трубілі б на ўвесь свет. Апошняе следства пачалося ў 97-м годзе. І матэрыялы дагэтуль засакрэчаны. Але ж гэта не прыватная справа, а тое, што цікавіць вельмі многіх. І грамадства мае права азнаёміцца з вынікамі расследавання. Але дагэтуль матэрыялы следства не апублікаваны.

— Чаму?

— Таму што яны не да спадобы ўладам. Пацвярджаюцца высновы камісіі 88-89 гадоў. Усе факты бясспрэчна сведчаць, што расстрэльвалі ў Курапатах НКВДзісты. Іншых вынікаў і не можа быць атрымана. Я кажу гэта як чалавек, які ўдзельнічаў у эксгумацыі магіл, калі Генеральная пракуратура там вяла першае расследаванне.

— А падчас апошняга вы кантактавалі са следствам?

— Мне прапаноўвалі ўдзельнічаць і ў гэтай камісіі. Расследаванне даручылі весці вайсковай пракуратуры. Я казаў, што калі ў іх і ўзнікаюць нейкія пытанні па Курапатах, то ў мяне іх няма.

У мяне няма таксама ніякіх сумненняў, хто ўсё гэта зрабіў. І я не магу бясконца капаць магілы. Пахаванне ёсць пахаванне. Яго нельга кранаць. Дванаццаць гадоў таму мы ўскапалі частку пахаванняў дзеля таго, каб узнавіць праўду. Больш не варта гэта рабіць. Магілы павінны заставацца магіламі.

Таму я адмовіўся ўдзельнічаць у следстве. Да таго ж разумеў: надышлі такія часы, калі вынікі следства незалежна ад нашага заключэння можна выкарыстаць так, як некаму захочацца.

Час ад часу ў афіцыйнай прэсе пракідваюцца матэрыялы, што ў Курапатах людзей расстрэльвалі фашысты. Гэта спробы падрыхтаваць грамадскасць да "перагляду" курапацкай справы.

— Неаднаразова ў Курапатах разбуралі пахаванні. Як вы думаеце, чыіх гэта рук справа?

— Цяжка дакладна сказаць. Можа, вандалы, якія разлічваюць знайсці нейкія каштоўнасці, а можа, гэта наўмысныя спробы знішчыць нашу памяць. Магчыма і яшчэ адно тлумачэнне. Нехта шукае пэўныя звесткі. Такая патаемная, неафіцыйная эксгумацыя. Але нікога за рукі не злавілі, ды і пракуратура па ўсіх нашых запытах нічога не выявіла.

— А гэта магчыма было зрабіць?

— Безумоўна. Можна было выставіць пасты, правесці міліцэйскія рэйды. Самыя масавыя разбурэнні магіл былі ў 98-99 гадах. Злачынцы раскопвалі па пяць-восем магілаў. Косці, што былі выкінутыя з зямлі, ляжалі горамі. Мы іх перазахавалі і паставілі крыжы найперш на разбураных вандаламі пахаваннях.

— Якімі звесткамі па рэпрэсіях у Курапатах сёння валодаюць навукоўцы? Дакладную колькасць расстраляных нельга выявіць?

— Паводле афіцыйнага заключэння першай камісіі, там забіта не менш за 32 тысячы чалавек. Называюць і іншыя лічбы. Ад дзесяткаў да дзвюх соцень тысяч. Гэта цяжка дакладна ўстанавіць, бо архівы КГБ недаступныя, закрытыя, але расстраляных вельмі многа.

Магільных ямаў больш за 600. Магчыма, некаторыя западзіны ўтварыліся і ў выніку нейкай гаспадарчай дзейнасці ці прыродных з'яў. Але такіх няшмат. Магіл у Курапатах закладзена велізарная колькасць.

Сярэдняе пахаванне мае памеры 2 на 3 метры. Ямы даверху запаўняліся забітымі людзьмі. Там можа быць ад 100 да 200 чалавек. Ёсць і больш буйныя пахаванні. І трэба таксама не забываць, што многія магілы былі знішчаныя, калі ў курапацкім лесе пракладвалі газаправод. Таму агульная лічба атрымліваецца вельмі вялікая. Але я лічу, што не так важна, колькі расстраляна. Галоўнае — тут, безумоўна, ляжаць ахвяры савецкіх рэпрэсій. І відавочцы тых падзей, паўтару, яшчэ жывыя.

— У студзені 1994 года Курапаты наведаў прэзідэнт ЗША Біл Клінтан падчас свайго візіту ў Мінск. Тады ж была ўсталявана і мемарыяльная лаўка з надпісам: "Ад народу Злучаных Штатаў Амэрыкі народу Беларусі дзеля памяці". Кажуць, тагачаснае кіраўніцтва рэспублікі рабіла ўсялякія спробы, каб Клінтан не наведваў курапацкі лес...

— Так, я добра памятаю гэта. Сапраўды, амерыканскага прэзідэнта палохалі тым, што беларускія спецслужбы не змогуць гарантаваць у лесе ягоную бяспеку. Але Клінтан усё роўна прыехаў. Ён доўга гутарыў з Зянонам Пазьняком, калі яны ішлі па сцяжынцы на лясную гару. Была вельмі сціплая, але шчырая цырымонія, устаноўлены мемарыяльны знак. Я мог назіраць, што Клінтан сапраўды перажываў.

— На вашу думку, як павінна быць ушанавана ў Курапатах памяць загінуўшых?

— Некалі мы ўсе пагадзіліся з Зянонам Пазьняком, што курапацкі лес павінен заставацца такім, якім ён ёсць. Я супраць стварэння велічных манументаў у савецкім разуменні. Самі магілы, гэта месца ўжо ёсць помнік. Мемарыяльныя знакі павінны ўпісвацца ў гэты лясны ландшафт. А ўсё манументальнае можа ўзводзіцца за межамі Курапатаў. Іншая справа, што нам трэба абавязкова пазначыць магілы, трэба ўпарадкаваць саму тэрыторыю. Крыжы, якіх шмат паставілі сёння, я лічу, гэта аснова, на якую павінны абапірацца ўсе праектанты, якія будуць штосьці рабіць і прапаноўваць. Людзі прывезлі ў Курапаты крыжы нават з Карэлічаў, Пінска і многіх іншых мясцін. Хацелася б, каб пачалі так пазначаць і іншыя месцы масавых рэпрэсій у розных кутках Беларусі.

Наталля ВАЛАКІДА.


Мітынг-рэквіем у Курапатах. 29 кастрычніка 2000 г.

Не прызналі сябе вінаватымі

8 кастрычніка, напярэдадні выбараў у Палату прадстаўнікоў, па ўсёй Беларусі ладзіліся мерапрыемствы ў дачыненні да гэтай падзеі. Заяўку на дазвол правядзення мітынгу і шэсця пад лозунгам "Супраць выбарчага фарсу – за дэмакратычныя выбары" яшчэ 21 верасня падалі ў Аршанскі гарвыканкам Віктар Андрэеў, рэдактар газеты "Куцейна" (гл. фота), і Юрый Санько, старшыня аршанскай рады Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ. Чыноўнікі, зразумела, ініцыятарам адмовілі. Тым не менш каля сотні аршанцаў сабраліся ля цэнтральнага ўваходу ў гарадскі



парк і са сцягамі і плакатамі прайшлі па цэнтральнай вуліцы да кінатэатра "Перамога", дзе і адбыўся мітынг.

Увечары таго ж дня актывісты, што падавалі заяву, атрымалі позвы ў міліцыю. Наступным днём на Віктара Андрэева і Юрыя Санько былі складзены пратаколы за арганізацыю несанкцыянаванага шэсця і мітынга. Справу перадалі ў суд. Але яго пасяджэнне было перанесена на 21 кастрычніка.

Суддзя Алена Аляксандраўна Дзямешчанка на працягу трох дзён разбірала "складанае" пытанне – ці можна лічыць Віктара Андрэева арганізатарам шэсця на падставе таго, што ён "трымаў бел-чырвона-белы сцяг", а Юрыя Санько – на падставе таго, што ён "ішоў побач" і абодва "заклікалі байкатаваць выбары і крытыкавалі сённяшнюю ўладу"? Вынік "прынцыповага" разбору адназначны – вынесці асуджаным пакаранне ў выглядзе штрафу па 150 мінімальных заробкаў кожнаму.

Але ў заключным слове Андрэеў і Санько падкрэслілі, што не лічаць сябе вінаватымі. Усё ж адбывалася ў рамках перадвыбарнай кампаніі, калі па выбарчаму заканадаўству не забаронены ніякія сустрэчы з выбаршчыкамі і дадатковы дазвол у гэты перыяд на грамадскія мерапрыемствы па пытаннях выбараў не патрабуецца.

Аршанскія адвакаты адмовіліся ўдзельнічаць у працэсе. Прызналіся, што ім "зверху" параілі не займацца гэтымі справамі, а то могуць застацца без ліцэнзій. Мясцовая філія Беларускага Хельсінкскага камітэта (БХК) таксама не праявіла аніякай цікавасці да справы. У адзначаны момант старшыня аршанскай філіі БХК Васіль Берасняў балатаваўся ў дэпутаты – не да таго было! У якасці грамадскага прадстаўніка выступіў і добра праявіў сябе юрыст Свабоднага прафсаюза Беларускага Алег Грабленскі.

Ул. інф.
Фота Ірыны ДУБОВІК.

ПРОГРАММА ТВ — ВТОРНИК, 7 НОЯБРЯ

БТ
7.00, 9.00, 15.00, Новости.
7.15 Х/ф. «Зеленый фургон». 2-я серия.
8.25 Документальный экран. «Букет Немана».
9.10 Дневник VI Международного музыкального фестиваля «Золотой шлягер-2000».
9.25 Х/ф. «Коммунист» («Мосфильм»).
11.10 «Песни юности наших отцов». VI Республиканский фестиваль в Витебске.
12.00 «Огненные птицы из Рио-Максима». Научно-популярный фильм.
12.30 «Алиса в Стране чудес», «Тайна Третьей планеты», «Бобик в гостях у Барбоса». Мультфильмы.
13.25 «Кортик». Худ.фильм для детей. 2-я серия.
14.35 «Лялькі» на «Белой Веже». Международный театральный фестиваль (г.Брест).
15.10 Мультфильмы.
15.30 «Этьен. Возвращение». Док.фильм.
16.00 VI Международный музыкальный фестиваль «Золотой шлягер-2000». Торжественное закрытие.
19.05 А.Михайлов, Л.Гурченко, Н.Дорошина в худ.фильме «Любовь и голуби» («Мосфильм»).
20.45 Дневник VI Международного музыкального фестиваля «Золотой шлягер-2000».
21.00 Панорама.
21.50 Х/ф. «Белое солнце пустыни».
23.10 Ток-шоу «Будни». Наши праздники.
23.55 Хоккей. Чемпионат Беларуси. ХК «Минск» - «Неман» (Гродно).

ОРТ
06.45 Слово пастыря.
07.00 Новости.
07.10 Комедия «Не может быть!».
09.00 Новости.
09.10 Пока все дома.
09.45 Фильм «Узник замка Иф». 3-я серия.
11.35 Играй, гармонь любимая!
12.05 Фильм «Цареубийца».
14.00 Новости.
14.15 «101 далматинец».
14.40 «Золотой граммофон».
16.45 «Ералаш».
17.00 Новости.
17.10 Фильм «Москва слезам не верит».
20.00 Время.
20.40 Боевик «Черный пес».
22.25 Фильм «Пиры Валтасара, или Ночь со Сталиным».

РТР
06.30 «Конек-Горбунок». Мультфильм.
07.40 Фестиваль солдатской песни «Виктория».
09.15 Прогноз погоды.
09.20 «Аншлаг» и Ко.
10.20 «Городок».
10.55 Фильм «Испытание верности».
13.00 Вести.
13.20 Диалоги о животных.
14.15 Планета Земля.
15.15 Док.фильм «Самолет» Максим Горький». Взрыв на Красной Площади».
16.10 «Аншлаг» и Ко.
17.15 Трилогия «Любить по-русски». Фильм 1-й.
19.00 Вести.
19.30 Трилогия «Любить по-русски». Фильмы 2-й, 3-й.
23.10 «Любить по-русски: Евгений Матвеев и его любимые женщины».
23.50 «Кинескоп».
00.00 Прогноз погоды.

НТВ
07.00 Сегодня.
07.15 Фильм «В добрый час!».
09.00 Сегодня.
09.15 Приключенческий фильм «Без видимых причин».
10.45 Фитиль.
11.00 Сегодня.
11.30 Комедия «Сравняться с отцом».
13.35 «Старый телевизор» представляет...
15.00 Сегодня.
15.40 Профессия - репортер.
16.05 Комедия «Московские каникулы».
18.00 Сегодня.
18.45 Футбол. Лига чемпионов. «Спартак» (Москва) - «Реал» (Мадрид).
21.00 Сегодня.
21.45 Премьера НТВ. «Российская империя».
22.50 Тушите свет.
23.05 Комедия «Клетка для безумцев-2».
00.55 Дневник Лиги чемпионов по футболу.

КУЛЬТУРА
09.05 «Бег». Худ.фильм. Часть 2-я.
10.50 Док.фильмы.
11.35 «Летите голуби». Концерт.
12.15 «Месье Ленуар, который...» Телеспектакль. Часть 1-я.
13.30 Новости культуры.
13.45 «Месье Ленуар, который...» Телеспектакль. Часть 2-я.
15.05 Цирковой чемодан.
15.30 «Двенадцать месяцев». Мультфильм.
16.25 «Цитаты из жизни».
17.05 «Секретный агент». Худ.фильм. 3-я серия.
17.55 Песни репертуара А.Миронова.
18.30 «Федор Хитрук. Профессия - аниматор». Док.фильм.
19.20 Вечерняя сказка.
19.30 Марису Лиепе посвящается...
21.00 Новости культуры.
21.20 Док.фильмы.
21.55 «Раба любви». Худ.фильм.

ТВ6
06.00 Боевик «Завтра не придет никогда».
07.35 Дорожный патруль.
07.50 День за днем.
09.25 Мультфильм «Первая зима».
09.35 Скандалы недели.
10.35 «Шоу Бенни Хилла».
11.40 Телемагазин в Минске.
12.00 Мультфильм «Звездный истребитель».
14.00 Новости.
14.15 «Олег Меньшиков. Монолог».
14.30 Комедия «Покровские ворота».
17.00 Телемагазин в Минске.
17.55 Программа «БИС».
18.30 «Петерс поп-шоу».
19.00 Новости дня.
19.30 Боевик «Кавказский пленник».
21.25 Дорожный патруль.
21.35 Боевик «Кто я?».
23.50 Дневник театрального фестиваля «Чайка».
00.10 Фильм «Страсти по Анжелике».

В Республиканскую ассоциацию инвалидов-колясочников (РАИК) входит почти 2,5 тысячи человек. Приблизительно 10 тысяч инвалидов Беларуси приравнены к колясочникам (это те, кто коляски не имеет).

ЖИЗНЬ НА КОЛЯСКЕ

письмо инвалида

"ВСЕ — НА УЛИЦУ!"

Об инвалидах принято говорить либо по поводу крупных мероприятий, вроде параолимпийских игр, либо в Международный день инвалидов (3 декабря). В развитой стране это было бы нормальным, поскольку инвалиды там социально защищены. У нас, если почитать Закон "О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь", инвалиды выглядят очень даже равноправными. Законодательная база хорошая. Но в жизни все не так, как на бумаге. Люди, обделенные физически, вынуждены день за днем бороться за свое право считаться полноценными членами общества, бороться со своими комплексами, бороться с комплексами окружающих людей (по отношению к инвалидам). То есть – своими силами воплощать в жизнь этот самый Закон.

Пенсии инвалида хватает лишь на два похода в магазин. Нет приспособлений для выезда на улицу, въезда в учреждения, в городской транспорт. А видел ли кто-нибудь лифт в школе? Немного лифтов и в вузах. Попав на коляску, человек оказывается вычеркнутым из жизни. "Инвалидов у нас нет" – так, видимо, в большинстве своем считают проектировщики, архитекторы и конструкторы. А вот если всю эту братию вместе с теми, от кого зависит поступление денежных средств, усадить на недельку-другую в инвалидную коляску, и не какую-то там заграничную, а нашу, родную, обязав при этом посещать работу, магазины и даже родительские собрания (в американской практике, кстати, такие случаи бывали – может, потому там эти вопросы решаются быстрее), тогда бы, наверное, в их "умных" головах что-нибудь да и просветлело. Конечно, кое-какие "подвижки" уже есть. Например, столичные "Макдональдсы" и Ледовый дворец в Минске на улице Притыцкого (мне довелось посетить эти места – там все на уровне, даже туалет специальный есть). Но это – капля в море. А как же школы, театры, магазины, библиотеки?..

